УДК 94(476):930«1897/1914»

# АГЛЯД ПЫТАННЯ БАРАЦЬБЫ ЗА ЦВЯРОЗАСЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНІЙ У ЧАСЫ “ВІННАЙ МАНАПОЛІІ” (1897–1914 ГГ.) У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

***Сяргей Мяньчэня***
*Мінск, Беларусь*

Артыкул прысвечаны агляду пытання барацьбы за цвярозасць на тэрыторыі беларускіх губерняў у перыяд 1897–1914 гг. у айчыннай савецкай і сучаснай гістарыяграфіі.

***Ключавыя словы: алкагалізацыя, Папячыцельства аб народнай цвярозасці, гістарыяграфія***

Праблема станаўлення цвярозага ладу жыцця і барацьбы з п’янствам з’яўлялася актуальнай для беларускага грамадства на мяжы XIX–XX стст. і захоўвае сваю актуальнасць і сёння. Вывучэнне дадзенай праблемы мае не толькі навуковае, але і практычнае значэнне і можа быць выкарыстана для выпрацоўкі сучасных праграм барацьбы з п’янствам, улічваючы вопыт і памылкі мінулага.

Не засталася без увагі дадзеная тэматыка і ў айчыннай гістарыяграфіі і антыалкагольнай літаратуры. Але ў большасці выданняў савецкага часу перыяд змагання

з п’янствам у канцы XIX – пач. XX ст. ці абмінаўся, ці разглядаўся з пункту гледжання дзяржаўнай ідэалагічнай дактрыны. Так, няма інфармацыі аб ім у выданні “Страшны вораг (кніжка аб гарэлцы)” Сымона Рак-Міхайлоўскага [1]. У кнізе С.Ф. Цярохіна “У фокусе канкрэтнага факта: праўда і мана пра ап'яняльныя напіткі” [2] разглядаецца гісторыя барацьбы з п’янствам у 50–60-я гг. XIX ст., а затым асвятляецца роля бальшавікоў у змаганні з алкаголем і палітыка савецкага ўрада ў гэтай сферы. Пабодным чынам пабудаваны і матэрыялы для лектараў “Из истории борьбы за трезвость на Гроденщине” [3]. У аснове іх агляд сітуацыі, якая склалася ў 1859–1861 гг. у Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губернях, дзе распачаўся масавы цвярозы рух, які распаўсюдзіўся затым на іншыя губерні і прывёў да замены сістэмы водкупаў на акцызную, але пра гэтыя змены аўтар не паведамляе. Аўтар адзначае народны характар гэтага руха, а вось духавенства проста дало “слабый толчок мысли”, ці нават тармазіла яго [3, с. 11, 12]. Галоўная роля ў аднаўленні руха за цвярозасць адводзіцца бальшавікам, якія “развернули пропаганду трезвости в органичной связи с борьбой за осуществление классовых целей трудящихся” [3, с. 15].

Калі дзяржаўная палітыка Мікалая II у накірунку барацьбы за цвярозасць і разглядалася, то звычайна адзначалася як негатыўная. Доктар М.І. Сандамірскі [4] асноўную ўвагу надае медыцынскім аспектам п’янства, але звяртаецца і да гісторыі пытання, У выданні ёсць інфармацыя аб дзяржаўнай віннай манаполіі, адзначаецца рост спажывання алкаголя ў адзначаны перыяд, што “дазваляла трымаць народ у беспрасветнай цемры” [4, с. 6], маюцца статыстычныя дадзеныя па смяротнасці, душэўнахворых, матэрыяльных стратах, пажарах, але яны маюць агульнарасійскі характар. Сандамірскі лічыў, што “карэнні алкагалізму трэба шукаць у тым царскім ладзе, які панаваў у нас цэлых тры стагоддзі”, а алкаголь гэта “зброя эксплуататараў, і як імкненне здабыць забыццё пры адсутнасці светлай будучыні” [4, с. 60].

Напэўна самым грунтоўным даследваннем савецкага часу ў айчыннай гістарыяграфіі па адзначанаму пытанню з’яўляецца манаграфія Т.С. Процькі “В борьбе за трезвость”[5]. Аўтар актыўна выкарыстоўвае матэрыялы дарэвалюцыйных выданняў, звяртаецца да арганізацыі і дзейнасці Папячыцельстваў аб народнай цвярозасці, але спецыфіка іх дзейнасці на тэрыторыі беларускіх губерній, як і архіўныя матэрыялы мясцовых папячыцельстваў, амаль не разглядаецца. Кніга мае і багаты статыстычны матэрыял, як напрыклад, інфармацыя аб спажыванні алкагольных напояў на душу насельніцтва ў заходніх губернях у 1907–1913 гг. [5, с. 73] Пры гэтым выданне не пазбаўлена ідэалагічнай афарбоўкі, аўтар прысвячае асобную главу дзейнасці бальшавікоў па барацьбе з п’янствам, пачынаючы з публікацый “Искры”, а вось “буржуазная” “Наша Ніва”, як дзеячы беларускага нацыянальнага руху, сярод тых, каго клапаціла праблема цвярозасці грамадства не значацца. У цэлым жа аўтар прыходзіць да высновы, што царскі ўрад не быў зацікаўлены ў барацьбе з алкагалізацыяй і забароне продажу спіртных напояў.

Пазбаўленне ад ідэалагічных канонаў дазволіла гісторыкам звярнуцца да праблемы барацьбы за цвярозасць з новага пункту гледжання, ацаніць ролю царквы, культурна-асветніцкую функцыю папячыцельтсваў аб народнай цвярозасці, як праяву дзяржаўнай палітыкі. Тым не менш сучасная беларуская гістарыяграфія пытання выглядае даволі сціпла.

Дзейнасць мясцовых Папячыцельстваў аб народнай цвярозасці разглядалася праз прызму гісторыі развіцця грамадскіх арганізацый у манаграфіях В.Ф. Бацяева [6] і М.А. Сакаловай [7]. С.Ф. Шымуковіч адзначае дзейнасць па барацьбе з п’янствам, як адну з форм дабрачыннасці [8].

Закранаецца тэма алкагалізацыі грамадства ў даследваннях Т.У. Вароніч, прысвечаных гарадскому жыццю на мяжы XIX–XX ст. і жыхарам “гарадского дна” [9, 10].

С.М. Васовіч [11, 12] прысвяціў шэраг артыкулаў ролі праваслаўнай царквы ў змаганні з п’янствам ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аўтар разглядае дзейнасць мясцовага

праваслаўнага святарства па арганізацыі пропаведзяў і размоў з насельніцтвам аб пагрозе п’янства, удзелу ў святах цвярозасці, арганізацыі таварыстваў цвярозасці, асвятляе дзейнасць неаторых з іх. Аўтар прыводзіць тэзіс, што праваслаўныя святары імкнуліся “не только ограничить распространение пьянства, но и отвлечь народ от питейных заведений путём укрепления в нём православной веры и организации различных христианских мероприятий в праздничные и воскресные дни”. Аднак гэта былі якраз дзеянні аднаго плана. Удзел святароў у працы Папячыцельстваў аб народнай цвярозасці разглядаецца аўтарам ускосна [11, с. 10, 11]. Тэзіс аўтара аб пасляховасці дзейнасці святароў па барацьбе з п’янствам у параўнанні з папярэднім часам не падцвярджаецца ні факталогіяй, ні статыстычнымі дадзенымі.

Параўнальнай характарыстыцы дзейнасці папячыцельстваў аб народнай цвярозасці на тэрыторыі Беларусі і Польшчы прысвечаны артыкул Ю. Падгайскага “Культурно-просветительская деятельность комитетов попечительства о народной трезвости в конце XIX – начале XX вв. в Польше и Беларуси” [13]. Гэта па сутнасці першая спроба даць адзнаку дзейнасці мясцовых папячыцельстваў аб народнай цвярозасці. Аўтар дае адзначэнне асноўным накірункам дзейнасці, выкарыстоўвае архіўныя матэрыялы Мінскага і Віцебскага павятовых папячыцельстваў. Разам з тым, некаторая інфармацыя, як напрыклад, аб колькасці народных чайных, падаецца ў агульнарасійскім маштабе, адсутнічае аналіз сацыяльнага складу камітэтаў. Адрозненні ў дзейнасці аўтар знаходзіць ў большай папулярнасці ў Польшчы народных чытанняў і бібліятэк і ў прысутнасці ва ўсіх сферах нацыянальнага польскага культурнага элемента [13, с. 210]. Аднак ён не тлумачыць прычыны гэтага, між тым як такое становішча можа вынікаць з дазвола выкарыстання польскай мовы і польскай літаратуры і адсутнасцю тых жа ўмоў у дачыненні да беларускай культуры.

Л.Ф. Рогач ў артыкуле “Чайная супраць карчмы” [14] разглядае змены ў дзяржаўнай палітыцы Расійскай Імперыі ў галіне барацьбы з алкагалізмам у другой пал. XIX – пач. XX ст. Аўтар адзначае асноўныя накірункі дзяржаўнай палітыкі – змаганне з корчмамі, стварэнне папячыцельстваў, увядзенне дзяржаўнай манаполіі і іх негатыўныя наступствы – павялічэнне колькасці таемных корчмаў, вулічнае п’янства і інш. Аўтар робіць высновы, што рэалізацыя палітыкі “віннай манаполіі” на тэрыторыі беларускіх губерній праходзіла больш лаяльна, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі імперыі з-за ніжэйшага узроўню п’янства [14, с. 83]

Артыкул “Некоторые аспекты административно-правового регулирования профилактики пьянства и алкоголизма в XVIII – начале XX столетия” В.В. Калягі [15] прысвечаны адміністрацыйным метадам змагання з п’янствам, сярод якіх вылучаюцца абмежаванне часу продажу, забарона подажу ў сувязі са святамі і мабілізацыйнымі мерапрыемствамі і інш. Аўтар робіць выснову аб росце узроўня прававога рэгулявання, але разам з гэтым падкрэслівае і рост спажывання спіртных напояў. Па незразумелай прычыне аўтар звяртаецца да выдання “Согласие против пьянства и агрономической помощи населению Минской губернии” [16] і называе яго прававым дакументам [10, с. 68], між тым як “Согласие…” з’яўляецца лістом агранома Бруноўскага да мінскага епіскапа Мітрафана, які быў надрукаваны ў епархіальных ведамасцях, а затым і выглядзе асобнага выдання.

Такім чынам, у айчыннай гістарыяграфіі праблема барацьбы з п’янствам на мяжы XIX–XX ст., дзяржаўная палітыка і грамадская пазіцыя па гэтаму пытанню прадстаўлены шэрагам прац, якія закранаюць толькі асобныя аспекты дадзенай тэмы. На нашую думку патрабуюць разгляду наступныя пытанні, якія засталіся па-за ўвагай іншых даследчыкаў:

– разгляд асноўных накірункаў дзейнасці мясцовых папячыцельстваў аб народнай цвярозасці і іх сацыяльнага складу;
– стаўленне да праблемы цвярозасці розных сацыяльных і нацыянальных груп - сялян, нацыянальнай інтэлігенцыі, яўрэйскага насельніцтва;

– сацыяльныя карані п’янства (паблажлівае стаўленне да п’яніц, традыцыі святкавання ўрачыстых падзей і інш.);
– пазіцыя праваслаўнай і каталіцкай царквы па пытанню цвярозасці і праблема іх узаемадзеяння паміж сабой і з дзяржавай у дадзенай сферы;
– праблема нелегальнага продажу алкагольных напояў і сурагатаў, а таксама дзейнасць праваахоўных органаў па барацьбе з ім;

Разгляд дадзеных пытанняў дазволіць вызначыць асаблівасці дзяржаўнай палітыкі і грамадскай думкі па праблеме спажывання алкагольных напояў, зразумець прычыны непаразумення ў дачыненні самога тэрміна “цвярозасць” – поўная адмова ці памеранае спажыванне, адзначыць неабходнасць правядзення паслядоўнай дзяржаўнай палітыкі па скараненню п’янства, падтрымкі прыватнай ініцыятывы і катэгарычнага недапушчэння фармалізма ў прафілактычна-асветніцкай працы з насельніцтвам.


1. Рак-Міхайлоўскі, С.А. Страшны вораг (кніжка аб гарэлцы) / Сымон Рак. – Менск : Белтрэстдрук, 1924. – 38 с.
2. Цярохін, С.Ф. У фокусе канкрэтнага факта : праўда і мана пра ап'яняльныя напіткі / С.Ф. Цярохін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 159 с.
3. Из истории борьбы за трезвость на Гроденщине / Правление Гродненской областной организаци общества “Знание”, Правление Гродненской областной организации добровольного общества любителей книги, Гродненский областной совет добровольного общества борьбы за трезвость. – Гродно, 1986. – 16 с.
4. Сандамірскі, М.І. П’янства – злейшы вораг чалавецтва / М.І. Сандамірскі. – Мінск : Белдзяржвыд, 1930. – 76 с.
5. Протько, Т. С. В борьбе за трезвость / Под ред. М. О. Бича. – Минск: Наука и техника, 1988. – 162 с.
6. Батяев, В.Ф. Развитие белорусских общественных объединений в XIX – 20-е годы XX века. Этнологическое исследование / В.Ф. Батяев / под науч. ред. А.И. Локотко. – Минск : Право и экономика, 2007.
7. Соколова, М. А. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX века: проблемы становления гражданского общества / М. А. Соколова. – Минск, 2002. – 136 с.
8. Шимукович, С.Ф. Благотворительность в Беларуси в конце XIX - начале XX века [Текст] : монография / С. Ф. Шимукович ; Акад. упр. при Президенте Республики Беларусь. – Минск : Акад. упр. при Президенте Республики Беларусь, 2006. – 187 с.
9. Воронич, Т.В. Губернский город Витебск на рубеже XIX-XX вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Т. В. Воронич; науч. рук. работы П. И. Бригадин; Белорусский гос. ун-т. – Мн., 2005. – 20 с.
10. Воронич, Т.В. Царские власти в борьбе за моральность минчан: вторая половина XIX – начало XX в. /Т.В. Воронич // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць: (да 945-годдзя Мінска): зб. навук. арт. / уклад. А.І.Груша; рэдкал.: А.А.Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2012 – С. 305–321.
11. Восович, С. М. Роль православного духовенства в утверждении трезвого образа жизни в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / С.М. Восович // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. – 2008. – № 1. – С. 9–11.
12. Восович, С. М. Опыт деятельности православного духовенства Беларуси по утверждению в народе трезвого образа жизни в конце ХИХ – начале XX в. / С.М. Восович // Системная транформация общества: инновация и традиции. – Брест : БГТУ, 2010 . – Вып. 7. – С. 35–39
13. Подгайский, Ю. Культурно-просветительская деятельность комитетов попечительства о народной трезвости в конце XIX – начале XX вв. в Польше и Беларуси / Юрий

Подгайский. // Актуальныя праблемы паланістыкі / рэдактары: Сяргей Важнік, Ала Кожынава. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – С. 205–211.

14. Рогач, Л.Ф. Чайная супраць карчмы. Барацьба з алкагалізмам на Беларусі ў 2-й палове XIX ст. / Л.Ф. Рогач. – Беларуская думка. – 2014. – № 5. – С. 79–83.
15. Коляго, В.В. Некоторые аспекты административно-правового регулирования профилактики пьянства и алкоголизма в XVIII – начале XX столетия / В.В. Коляго // Актуальные проблемы экономического развития Республики Беларусь и его правовое регулирование / [научный редактор Г.Б. Шишко]. – Минск : Интегралполиграф, 2009. – С. 66–69.
16. Бруновский, В.Х. Согласие против пьянства и агрономическая помощь сельскому населению Минской губернии / В. Бруновский. – Минск : Электротипография С.А. Некрасова, 1914. – 8 с.